***В. М. Майсюк***
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

# УЗАЕМААДНОСІНЫ ЧАЛАВЕКА І ПРЫРОДЫ Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Узаемаадносіны паміж прыродай і чалавекам — гэта праблема, якая хвалявала, хвалюе і будзе хваляваць чалавецтва. Глабальна гэтай праблемай займаюцца спецыялісты па ахове навакольнага асяроддзя: яны даследуюць і папярэджваюць, вывучаюць і выпраўляюць. Але людзі мастацтва (паэты, пісьменнікі, мастакі і інш.), у адрозненне ад іх, заклікаюць чалавецтва, прымушаюць задумацца.

У час сацыяльных бур і ўзрушэнняў, час праяўлення неспасціжнай вышыні чалавечага духу і яго ганебнасці, час складанасцей і супярэчлівасцей праблема «чалавек і прырода» з'яўляецца адной з цэнтральных. Па меркаванні У. Маранцмана, «гармонія з прыродай была нормай для светаўспрымання А. Пушкіна, жаданай і недасягальнай марай М. Лермантава» [1, с. 126]. Але калі героі XIX стагоддзя спрачаліся пра тое, што такое прырода — храм ці майстэрня, то стагоддзя XX, азоранае дасягненнямі навукова-тэхнічнага прагрэсу, павярнула гэтую праблему ў плоскасць экалагічную, спалучаную з усім спектрам праблем маральных.

Чалавек з’яўляецца часткай Сусвету і па гэтай прычыне знаходзіцца ў гармоніі з навакольным асяроддзем. Але ў той жа час чалавек (як асоба) — феномен слоўнай інфармацыі [2, с. 140]. Вядома, што менавіта мова вылучыла чалавека з прыроды, аддзяліла ад жывёльнага свету. Чалавек — гэта адзіная істота, якая ўмее гаварыць. Увесь астатні жывы свет не можа выказаць свае думкі, свае патрэбы, свае жаданні, свае адносіны да жыцця, і ў гэтым сэнсе ён бездапаможны і безабаронны. Таму на чалавека кладзецца абавязак не толькі абараняць сябе самога, але і выступаць ад імя ўсяго жывога навокал.

Прырода — гэта надзвычай складана арганізаваная сістэма, якая здольна да пастаяннага самаўдасканалення, да бязмежных магчымасцей развіцця. А паколькі чалавек з’яўляецца часткай прыроды, то закон самаўдасканалення адносіцца і да яго. Але, на жаль, чалавек найбольш з усіх прыродных стварэнняў супрацiўляецца натуральнаму працэсу суіснавання ў гармоніі з прыродай. На яго больш уплываюць грамадска-палітычныя і эканамічныя фактары, якія яму здаюцца самастойнымі, незалежнымі ад прыроды. Але тым не менш чалавек проста павінен пачуць няўмольны голас прыроды.

Рэпазіторый БарДУ

Шчаслівым будзе той народ, які жыве ў згодзе з прыродай. Менавіта так жылі нашы продкі, якія стваралі філасофію свайго адзінства з прыродай.

Прырода — той навакольны свет, без якога проста немагчыма ўявіць жыццё чалавека, яго пачуцці і думкі. Так, чалавек і прырода знаходзяцца ў непарыўным адзінстве ў аповесці Э. Ажэшкі «Хам». Галоўны герой Павел Кабыцкі так гаворыць пра сваю еднасць з навакольным светам: «Неба — мая хата, а рака — жонка». Ён паўстае перад чытачом як прыродны, натуральны чалавек, «душа і цела якога зжыліся з вольнымі прасторамі ракі і неба, з чыстым паветрам, з глыбокай цішынёй самотных дзён і вачэй» [1, с. 23]. І калі чалавек жыве ў адзінстве з прыродай, то без сумневу, зберагае яе прыгажосць.

Безумоўна, прыгажосць прыроды залежыць ад чалавека.

Тэма ўземаадносін чалавека і прыроды валодае дзіўнай ёмістасцю і філасофскай шматмернасцю. У творчасці вялікіх мастакоў слова яна з'яўляецца сапраўды агульначалавечай, раскрываючы адначасова і сацыяльны, і маральны, і філасофскі характар часу і падзей. Гэтай тэмай прасякнуты творы для чытачоў самых розных узростаў. Яна гучыць у творах І. Пташнікава (апавяданне «Алені», «Мсціжы»), Г. Далідовіча («Губаты»), А. Жука («Паляванне на Апошняга Жураўля», «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел»), В. Казько («Неруш»), В. Карамазава (раман «Пушча»), Х. Лялько («Світанне над бярозамі»), М. Прышвіна («Синий лапоть», «Лесной хозяин», «Кладовая солнца»), К. Паустоўскага («Заячьи лапы», «Мещёрская сторона»), В. Астаф'ева («Царь-рыба», «Зачем я убил коростеля», «Белогрудка»), Ю. Бондарава («Берег»), Ч. Айтматава («Плаха») і шматлікіх іншых мастакоў слова.

Заклік пісьменнікаў абараняць прыроду, жыць з ёю ў згодзе абумоўлены трывогай за будучае нашай Зямлі, за маральны стан сучаснага грамадства. Менавіта па гэтай прычыне ў літаратуры ідзе гарачая гутарка аб адносінах чалавека з прыродай.

## Спіс крыніц

1. *Бельскі, А. І.* Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: Класікі і сучаснікі ў школе / А. І. Бельскі. — Мн. : Аверсэв, 2005. — 352 с.

2. *Шамякіна, Т.* Прырода і культура / Т. Шамякіна // Род. слова. — 1996. — № 4. — С. 137—141.

Материал поступил в редакцию 04.10.2011.

Репозиторий БарГУ